***Свірыдзенка В. І.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. III клас

## Змены ў змесце вучэбнага дапаможніка для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

У 2023/2024 навучальным годзе ў III класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання навучанне беларускай мове будзе адбывацца па вучэбным дапаможніку:

*Свірыдзенка, В. І.* Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — 2-е выд., перагледж. і дап. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2023.




Дапаможнік дапрацаваны па выніках вопытнай праверкі, праведзенай у 2017/2018 навучальным годзе, а таксама па прапановах настаўнікаў — удзельнікаў дыялогавай пляцоўкі «Якасць вучэбных дапаможнікаў па вучэбных прадметах для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі», якая адбылася 6 ліпеня 2022 у дзяржаўнай установе адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі».

У змест вучэбнага дапаможніка ўнесены ***шэраг змен***.

1. Зменены пералік умоўных абазначэнняў з мэтай рэалізацыі адзіных патрабаванняў да структуры і навігацыйнага апарату ў вучэбных выданнях для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі (мал. 1).

2. Спрошчаны працэс пераходу праз QR-код да выканання інтэрактыўных заданняў па тэме ўрока. Яны змешчаны на сайце http://eior.by (3 клас, Беларуская мова — Тэма ўрока — кнопка «Дадатковыя матэрыялы»).

3. У практыкаваннях на складанне навучэнцамі алгарытмаў колерава выдзелены крокі алгарытму (мал. 2).

4. Выкарыстана графічнае абазначэнне пачатку ўрока для візуальнага раздзялення дыдактычнага матэрыялу розных урокаў (мал. 3).

**Умоўныя абазначэнні:**

[?!] — праблемнае пытанне;

[Рм] — заданне па развіцці маўлення;

[A] — слоўнік;

— дамашняе заданне;

— заданне, якое выконваецца па жаданні;

— інтэрактыўныя заданні на сайце https://eior.by (3 клас, Беларуская мова — Тэма ўрока — кнопка «Дадатковыя матэрыялы»).

*Малюнак 1*

**196.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння кораня ў слове *смятана*.

1. Падбіраем да слова ... .
*Смятана — смятанка, смятанны, смятаннік.*

2. Выдзяляем у словах ... .
*Смятана, смятанка, смятанны, смятаннік.*

3. Памятаем, што пры ўтварэнні і змяненні слоў у корані можа адбывацца ... .
*Смятана — сметанковы.*

4. Абазначаем корань у слове ... .
*Смятана.*

*Малюнак 2*

188. Прачытайце. Вызначце націскныя склады ў словах. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

н..с — н..саты　　стр.́льба — стр..ляць
р..г — р..гаты　　ш..пт — ш..птаць

Абазначце корань у словах. Якія змены адбыліся ў корані слоў? Чаму?

Пры ўтварэнні і змяненні слоў можа адбывацца змена гукаў (чаргаванне). Часцей за ўсё чаргаванне сустракаецца ў корані слоў: *рэчка — рачны, кот — кацяня, снег — сняжок, слёзы — сляза, хада — хадзіць.*

*Малюнак 3*

187. Адгадайце загадку. Спішыце.

**Хто зімы не баіцца?**



Убор у птушкі яркі.
Яна ад снежнай хмаркі
не адляцела ў вырай,
а дома, тут, дзе вырасла,
перазімуе зімку
з завеяй у абдымку.
*Л. Багдановіч.*

Знайдзіце ў загадцы аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань.

❖ Падбярыце да іх іншыя аднакаранёвыя словы і запішыце.

*Малюнак 4*

5. Скарэкціраваны аб'ём дамашніх практыкаванняў. Яны дапоўнены заданнямі, якія выконваюцца вучнямі па жаданні (мал. 4).

6. Пераразмеркаваны слоўнікавыя словы па дзвюх частках вучэбнага дапаможніка. У першую частку дапаможніка ўключаны слоўнікавыя словы *асцярожны, смяяцца, воблака.* Гэта дазволіць забяспечыць патрэбным моўным матэрыялам змест кантрольных слоўнікавых дыктантаў у першым паўгоддзі.

7. Дабаўлены пералік слоўнікавых слоў у першую частку вучэбнага дапаможніка.

8. Павялічана колькасць слоў, значэнне якіх тлумачыцца на старонках вучэбнага дапаможніка ў рубрыцы «Слоўнік». Графічна абазначаны націск у некаторых рэдкаўжывальных словах.

9. Павялічана колькасць заданняў, якія адсылаюць вучняў да працы з форзацамі (мал. 5).

10. Зменена падача матэрыялу ў рубрыцы «Праверце сябе», прызначанай для арганізацыі кагнітыўнай рэфлексіі пасля вывучэння кожнага раздзела вучэбнага дапаможніка. У рубрыку ўключаны два блокі: «Адкажыце на пытанні» і «Творчая хвілінка». Першы блок утрымлівае пералік пытанняў, якія дапамогуць вучням узнавіць веды, атрыманыя пры вывучэнні раздзела; другі — дадатковыя творчыя заданні, выкананне якіх патрабуе прымянення ведаў, уменняў і навыкаў, набытых у ходзе вывучэння раздзела. Напрыклад, пасля вывучэння раздзела «Тэкст» вучням неабходна спачатку адказаць на пытанні: *Што такое тэкст? На што можа ўказваць загаловак тэксту? Што такое тэма тэксту? Што такое асноўная думка тэксту? Што раскрывае і перадае план тэксту? Як скласці план тэксту?* Далей трэцякласнікам прапануецца выканаць наступныя заданні:

- Уявіце сябе пісьменнікамі. Вам трэба скласці казку, загалоўкам якой будзе наступная прыказка: *Кошка мышцы не таварыш.* Пра каго можна так сказаць? На што будзе ўказваць такі загаловак тэксту: на тэму ці на асноўную думку тэксту?
- Складзіце і запішыце план вашай казкі.
- Прыдумайце казку і раскажыце яе аднакласнікам.

74. Разгледзьце схему «Тыпы сказаў» на форзацы і прачытайце сказы. Вызначце, якімі па мэце выказвання з'яўляюцца сказы з практыкавання 73. Якому са сказаў адпавядае кожная схема?

1. |апав.|.　2. |пыт.|?　3. |пабудж.|.

*Малюнак 5*

11. Унесены змены ў дыдактычны матэрыял некаторых урокаў. Павялічана колькасць практыкаванняў з фразеалагізмамі. Напрыклад, на этапе паўтарэння ў пачатку навучальнага года арганізуецца праца па засваенні вобразнага выразу *з вераб'ёў нос.*

Уключана заданне, якое прадугледжвае прапедэўтычнае знаёмства з цытатным планам. Так, на ўроку па тэме «План тэксту» трэцякласнікам прапануецца разгледзець малюнкі да беларускай народнай казкі і прачытаць план, складзены са слоў гэтай казкі. Даецца заданне прыгадаць назву казкі і расказаць яе з апорай на малюнкі і план.

Прапанаваны практыкаванні, якія маюць на мэце выпрацоўку ў навучэнцаў уменняў будаваць разважанні.

Павялічана колькасць заданняў на пераклад з рускай мовы на беларускую.

**Распрацоўкі гэтых урокаў будуць змешчаны ў наступных нумарах часопіса «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа».**

З мэтай рэалізацыі дыферэнцыраванага падыходу да навучання, замацавання моўных уменняў і навыкаў навучэнцаў III класа дадаткова можна выкарыстоўваць вучэбнае выданне: *Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : 3-ці кл. : рабочы сш. : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Свірыдзенка. — Мінск : Аверсэв. — 96 с.*

У сшытку знаходзяць працяг і развіццё зместавыя лініі, прадстаўленыя ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове.

Змены ў змесце вучэбнага дапаможніка знайшлі адлюстраванне ў каляндарна-тэматычным планаванні па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (2023/2024 навучальны год).